9(47.60)
З-42

Смерць нямецкім акупантам!

# ЗВАРОТ ВОЇНАЎ БЕЛАРУСАЎ ДА ПАРТЫЗАН І ПАРТЫЗАНАК, ДА ЎСЯГО БЕЛАРУСКАГА НАРОДА

ВЫДАВЕЦТВА ЦК КП(б)Б
«СОВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ»
1943

Кнв. 1954 г.

1249 др.

# ГОЛАС БЕЛАРУСКАГА НАРОДА

Вайна, якую мы вядзем з гітлераўскай Германіяй, гэта вайна ўсяго совецкага народа супроць нямецкіх захопнікаў. Два гады насмерць стаяць народы Совецкага Саюза супроць лютага і ненавіснага ворага. Украіна і Беларусь, Казахстан і Грузія, Сібір і Прыбалтыка, уся наша краіна, усе нашы народы адзіныя ў гэтай гіганцкай бітве, у барацьбе за будучыню ўсяго совецкага народа, усяго чалавецтва.

Учора са старонак нашых газет прагучэў страсны голас беларускага народа. Воіны-беларусы, звяртаючыся да партызан і партызанак, да ўсяго беларускага народа, даюць клятву, што яны свята выканаюць загад вялікага Сталіна, што не пашкадуюць яны ні крыві, ні жыцця свайго ў барацьбе за вялікую справу, за разгром гітлераўскіх катаў.

На мірныя, квітнеючыя гарады і вёскі Беларусі зваліўся першы ўдар злоснага ворага. Першыя былі заліты крывёю мірных людзей, ахутаны дымам пажараў беларускія гарады і вёскі. Па іх балела сэрца кожнага совецкага чалавека, за іх запалілася яно першымі агнямі ненавісці.

Два гады насаджаюць нямецкія акупанты свой новы, крывавы парадак на Беларусі. Два гады знішчаюць яны беларускі народ.

Тысячы беларускіх юнакоў і дзяўчат угналі яны ў рабства, тысячы непакорных згнаілі ў сваіх казематах. Але не пакарыліся совецкія людзі Беларусі нямецкай няволі.

Праваліліся планы гітлераўскіх разбойнікаў, не ўдалося ім прымусіць беларускі народ гнуць спіны для праклятых захопнікаў. У першыя часы яшчэ хваліліся нямецкія грабежнікі, што ім удасца анямечыць беларускія землі, насадзіць там нямецкіх памешчыкаў і каланістаў. А цяпер брудненькая гітлераўская газетка «Мінскер цэйтунг» вымушана прызнаць, што страх перад партызанамі гоніць гітлераўцаў з Беларусі.

У лясах і балотах Беларусі гарыць полымя партызанскай вайны. Не запалохалі нямецкія кулі совецкіх людзей, за тое гітлераўцы напалоханы совецкімі партызанамі. Намеснік германскага міністра шляхоў зносін, паездзіўшы нядаўна па захопленых совецкіх тэрыторыях, упэўніўся, што няма па сутнасці розніцы паміж фронтам і тылам, што нямецкіх чыгуначнікаў на кожным кроку чакае партызанская куля або міна. Два месяцы назад, 10 чэрвеня, слаўныя беларускія партызаны знішчылі цэлую групу гітлераўскіх чыноўнікаў і катаў, прысланых на Беларусь для рабаўніцтва і разбою. Былі забітыя «абласны камісар» Людвіг Эрэнлейтнер, «урадавы інспектар» Генрых Клозе, начальнік абласной жандармерыі і яшчэ некалькі жандармаў і «гаспадарчых кіраўнікоў». Гэта адзін з эпізодаў слаўнай партызанскай барацьбы.

У 1918 годзе ад страху беглі нямецкія войскі з Беларусі. Адзін немец пакінуў тады

на Слуцкай дарозе на сцяне хаты надпіс: «Божа, вярні мяне жывым у Германію». Не! Не ўцячы жывымі нямецкім захопнікам з Савецкай Беларусі!

Беларускія партызаны трымаюць у смяртэльным страху ворага. Яны разбураюць яго камунікацыі, пускаюць пад адкос яго воінскія эшалоны. Яны дапамагаюць сваім беларускім братам, якія змагаюцца ў радах Чырвонай Арміі за чэсць і свабоду Радзімы. Беларускі народ ганарыцца сваімі партызанамі і партызанкамі. Ён ганарыцца сваімі слаўнымі воінамі— генераламі, афіцэрамі, байцамі гераічнай Чырвонай Арміі.

На франтах айчыннай вайны ў радах Чырвонай Арміі змагаюцца 108 генералаў-беларусаў, сотні палкоўнікаў, сотні тысяч байцоў. Праслаўлены на ўвесь свет імёны герояў-беларусаў: генерал-маёра Даватара, слаўнага абаронца Масквы, герояў Савецкага Саюза капітана Гастэла і Віктара Талаліхіна. Гэта — любімыя імёны савецкага народа. Іх ведае кожны школьнік. Імі ганарыцца ўся краіна, як ганарыцца яна і тымі першымі партызанамі, якія атрымалі званні Герояў Савецкага Саюза. Гэта былі беларускія партызаны, героі беларускіх палёў і лясоў — Бумажкоў і Паўлоўскі. Партызаны Канстанцін Сяргеевіч Заслонаў, Сільніцкі, Казлоў! Двойчы Герой Савецкага Саюза Грыцавец! Слаўныя вашы подвігі не памруць, не памруць вашы справы! На подступах да Масквы, пад сценамі Сталінграда, у лясах Смаленшчыны, пад Ленінградам вы абаранялі родную Беларусь.

«Твае сыны не зганьбілі чэсці воіна Чырвонай Арміі, не зняславілі памяці нашых продкаў. Яны свята выконваюць наказы бацькоў і прадзедаў аб кроўным адзінстве з рускім і ўкраінскім народам... — пішуць воіны Беларусі ў сваім звароце. — Яшчэ ў палоне беларуская зямля. Яшчэ ў няволі гітлераўскай пакутуюць нашы браты і сёстры. Яшчэ топча агідны забойца зямлю Радзімы... Яшчэ не астылі на зямлі слёзы замучаных матак і сёстраў, яшчэ дымяцца крывёю магілы родных і блізкіх, загубленых катамі-людаедамі. Целы загінуўшых заклікаюць нас да помсты, стогны заняволеных клічуць нас да жорсткай барацьбы, да суровай адплаты ворагу. Голас продкаў заклікае нас:

Лютая помста катам!»

Воіны-беларусы клічуць беларускіх партызан і партызанак, увесь беларускі народ граміць варожыя тылы, дапамагаць усімі сіламі Чырвонай Арміі ў барацьбе з гітлераўскімі прыгнятальнікамі.

Подлы вораг, напаўшы на нашу краіну, разлічваў на бойку паміж народамі нашай краіны. Не выйшла! Вораг наткнуўся на такую згуртаваную сілу, на такое адзінства народаў Совецкага Саюза, супроць якога не ўстаіць ніякая разбойніцкая ваенная машына. Совецкі народ выйдзе з гэтай вайны больш моцным, больш адзіным, больш згуртаваным, чым калі-б то ні было. У такіх вялікіх гістарычных выпрабаваннях правяраецца і выяўляецца сіла, веліч духу магутнага народа магутнай краіны.

Няхай дрыжыць вораг! Праз дым пажараў на Беларусі, у яе гарадах, сёлах, лясах, пачуе ён заклік воінаў-беларусаў:

Слава радзіме нашай Беларусі, слава Чырвонай Арміі і партызанам, слава Сталіну!

Пачуюць заклік беларускія партызаны і партызанкі. Пачуюць і адклікнуцца.

Тысячамі нямецкіх трупаў адкажа Савецкая Беларусь. Голас беларускага народа данясецца праз грукат баёў пад Харкавам і Бранскам да Берліна, да гітлераўскіх катаў. Няхай дрыжаць ворагі. Іх чакае самая жорсткая помста за слёзы, за гора, за пакуты, прынесеныя савецкім людзям.

«Мы памятаем усё і за кожную кроплю пявіннай крыві адплоцім ворагу ў стократ. Ні адной слязы не даруем, ні адной раны не забудзем, ні адной крыўды не прапусцім, — за ўсё разлічымся поўнасцю і ў грознай расплаце сваёй не паскупімся... Смерць нямецкім катам і забойцам!»

Чырвоная Армія наступае далей. Яе натхніў на новыя баявыя подвігі гістарычны загад Вярхоўнага Галоўнакамандуючага Маршала Савецкага Саюза таварыша Сталіна. Яна зверне беларускаму народу яго родныя гарады, яго родныя нівы. І зноў адродзіцца на Беларусі шчаслівае, поўнакроўнае, радаснае жыццё пад пераможным сцягам Леніна — Сталіна.

☆

## ЗВАРОТ ВОІНАЎ-БЕЛАРУСАЎ ДА ПАРТЫЗАН І ПАРТЫЗАНАК, ДА ЎСЯГО БЕЛАРУСКАГА НАРОДА

Да цябе, народ наш, народ-волат, звяртаюцца сыны твае — беларускія воіны. Шлём мы сыноўны паклон роднай зямлі. Пасылаем баявое прывітанне маткам і бацькам, братам і сёстрам, жонкам і дзецям нашым. Пасылаем мы наша брацкае прывітанне гераічным партызанам і партызанкам.

Кожны дзень і кожную гадзіну носім мы ў сэрцы вобраз любімай Радзімы, кожным дыханнем сваім, кожнай думкай сваёй з вамі мы, дарагія, з вамі, любімыя.

Многа дзён прайшло, як пакінулі мы родныя дарогі, як рассталіся мы з вамі. Але і сёння перад намі ўстаюць шырокія і бясконцыя, налітыя буйным коласам нашы нівы, шумлівыя лясы, зялёныя, як мора, сенажаці, блакітныя азёры і велічавыя рэкі: Дзвіна і Дняпро, Бярэзіна і Сож, Прыпяць і Нёман. З глыбіні вякоў устаюць перад намі старажытныя паселішчы і гарады: Тураў і Пінск, Гродна і Несвіж, Полацк і Магілеў, Віцебск і Гомель, Мсціслаўль і Брэст, Мінск і Супрасль.

Родная Беларусь, у тваіх добраўпарадкаваных гарадах, пабудаваных працавітай рукой народа, упрыгожаных і памножаных працай сыноў тваіх, дыміліся фабрыкі і заводы, у іх квітнелі інстытуты і універсітэты. Пад кіраўніцтвам вялікай партыі Леніна — Сталіна мы, беларусы, выйшлі на дарогу свабоднага і раданага жыцця. Пад кіраўніцтвам большэвікоў Беларусі мы кавалі баявое адзінства нашых радоў, мацавалі непарушную дружбу брацкіх народаў. У гэтым брацтве нашым, у гэтай сталінскай дружбе нашых народаў — залог нашых перамог, непахіснасці нашых поспехаў.

І вось два гады, як стаім мы насмерць у жорсткай барацьбе з вераломным ворагам, які запаланіў наш родны край, апаганіў нашу зямлю, запаскудзіў нашы рэкі, зруйнаваў гарады і сёлы, знішчыў сотні тысяч нашых людзей.

Нашы сэрцы паліць вялікая, бессмяротная нянавісць да ворага. Гэтай нянавісцю адточаны нашы штыкі, гэтай нянавісцю дыхаюць нашы кулі, якія метка б'юць ворага. Гэта нянавісць вядзе нас у грозную атаку, яна кліча нас біць ворага, біць яго люта, няшчадна, насмерць. Гэта нянавісць рухала нас, і мы нанеслі грозны ўдар полчышчам азвярэлага ворага, падарвалі яго сілы, сарвалі яго каварныя планы і замыслы, абяскровілі яго.

З рускімі і ўкраінскімі братамі, з сынамі Грузіі, Арменіі і Азербайджана, з усімі сынамі свабодалюбівых народаў Совецкага Саюза мы, беларусы, грамілі ворага, гналі назад яго полчышчы ад роднай Масквы, ад сцен горада

Леніна, засцілалі варожымі касцьмі прадгор'і Каўказа, сотні тысяч ворагаў паклалі ля цвярдынь Сталінграда.

Зараз на франтах Айчыннай вайны ў радах Чырвонай Арміі за цябе, наша Беларусь, змагаюцца 108 генералаў-беларусаў, сотні палкоўнікаў, сотні тысяч воінаў. Твае сыны не зганьбілі чэсці воіна Чырвонай Арміі, не зняславілі памяці нашых продкаў. Яны свята выконваюць наказы бацькоў і прадзедаў аб кроўным адзінстве з рускім і ўкраінскім народамі. Як адзіны магутны Дняпро, які ўскарміў старадаўнія плямёны рускіх, беларусаў і ўкраінцаў, так адзіная іх гісторыя і культура, адзіныя іх жаданні і інтарэсы. З глыбіні сівых вякоў чуем мы громы бітваў вялікіх нашых продкаў за свабоду і незалежнасць трох братоў-народаў. Спрадвеку беларускі народ, як і яго браты — рускія і ўкраінцы, бачыў у немцах кроўных ворагаў сваіх. На рацэ Нямізе ў Мінску продкі беларусаў, рускіх і ўкраінцаў «веялі варожыя душы ад цела». Не раз полацкія дружыны дапамагалі рускім братам граміць нямецкіх захопнікаў, біць немцаў з тэўтонскага і лівонскага ордэнаў. У 1307 годзе мужныя полацкія воіны, не шкадуючы жыцця свайго, перабілі немцаў, што ўварваліся ў Полацк, і ачысцілі ад іх горад. У войсках Александра Неўскага, які разбіў у красавіку 1242 года псоў-рыцараў на лёдзе Чудскога возера, храбра змагаліся і дружыны беларускага народа. Беларусы ўдзельнічалі ў разгроме немцаў пад Грунвальдам. Нашы продкі змагаліся супроць нямецкіх захопнікаў усімі магчымымі сродкамі.

Беларусы не раз змагаліся з ворагам у радах рускіх армій, паказаўшы ўзоры воінскай доблесці і геройства. Яны былі ўдзельнікамі Сямігадовай вайны, удзельнікамі разгрому хвалёных войск «неперараможнага» прускага караля Фрыдрыха II. Яны ў радах рускай арміі гамілі полчышчы Напалеона, дзе былі і прускія палкі, партызанскімі атрадамі дабівалі ў беларускіх лясах рэшткі яго арміі, тапілі іх у глыбокіх водах роднай Бярэзіны. У 1918 г. яны гамілі кайзераўскія войскі, выганялі іх за межы Расіі, Украіны і Беларусі. Ад страху ўцякалі тады немцы з нашай зямлі. Аб гэтым страху гаворыць нямецкі надпіс, выразаны нажом на сцяне дома на Слуцкай дарозе недалёка ад горада Несвіжа ў 1918 годзе: «Божа, вярні мяне жывым у Германію...». Але нямногія з іх вярнуліся жывымі назад. Нямногія з ворагаў вернуцца назад і цяпер. Ім не жыць на нашай зямлі, не ўбачыць вавек і нямецкай зямлі.

Не раз у лютыя годы ліхалецця паўставалі беларусы супроць сваіх прыгнятальнікаў. У народнай памяці захаваліся імёны народных правадыроў, кіраўнікоў паўстанняў у барацьбе за сваю годнасць, за сваю чэсць і свабоду. Такія легендарныя імёны Налівайкі і Галоты, Крывашапкі і Гаркушы, Вашчылы і Каліноўскага. Іх мужнасць у нашай крыві, іх доблесць у нашых справах, іх гераізм у нашых схватках з ворагам. Мы памножылі подвігі продкаў, узвялічылі славу народа. Будзе ў вяках грымець імя незабыўнага сына беларускага народа Героя Совецкага Саюза капітана Гастэла. Ён і смерць сваю ператварыў у са-

крушальны ўдар па ворагу, абрушыўшы палаючы самалёт свой у самую гушчу ворагаў. Праз геранчную смерць прышоў ён да вечнага бяссмерця, да вечнай славы. Не забудзе народ і самаадданы подвіг свайго сына — танкіста, Героя Совецкага Саюза Палаўчэні. Паранены, ён вёў свой танк, знішчаючы і сакрушаючы ворага. На танк накінулася злая арава немцаў. Яны ўскочылі на танк, прапанавалі здацца. Не здаўся герой. Немцы падпалілі танк, смерць людзей у ім здавалася немінучай, яна ўжо глядзела ў вочы ім, чакала іх апошняга ўздыхання. Але не аб смерці думаў сын Беларусі, ён думаў аб помсце ворагу. «За Радзіму, за Сталіна!» — кінуў ён кліч баявым сябрам, і танк пранёсся вогненным смерчам па нямецкіх акопах, знішчаючы ворагаў, сакрушаючы іх тэхніку. Герой і яго экіпаж засталіся жывыя.

На подступах да Масквы граміў ворагаў легендарны сын Беларусі, Герой Совецкага Саюза, генерал-маёр Даватар. Яго казацкія палкі крушылі фашыстаў на франтах і ў глыбокім нямецкім тыле. Грозныя лавы казакоўдаватарцаў наводзяць і цяпер смяртэльны жах на нямецкіх захопнікаў.

Герой Совецкага Саюза беларус Віктар Талаліхін сокалам налятаў на фашысцкія самалёты, якія ірваліся са смертаносным грузам да радзімай Масквы. Там, дзе з'яўляўся самалёт Талаліхіна, там знаходзілі лютую смерць фашысцкія сцярвятнікі, там не было дарогі самалётам ворага.

На марскіх прасторах Балтыкі расправіў свае арліныя крыллі Герой Совецкага Саюза,

сын нашага народа лётчык-знішчальнік Аляксей Антоненка. Тут таціў ворагаў сын Беларусі віцэ-адмірал Дрозд.

Сілу бомбавых udараў Героя Совецкага Саюза лётчыка Івана Каўшарава не раз спрабавалі ворагі на сваіх галовах. Часта мітусіліся ў смяротэльнай паніцы іх калоны, узляталі ў паветра іх машыны і танкі, калі насцігаў іх цень крылляў героя.

Больш сотні фашыстаў знішчыў на подступах да Ленінграда бясстрашны снайпер-беларус, юны Герой Совецкага Саюза Хвядос Смалячкоў.

На палях бітваў ратнай славай пакрылі сябе тысячы сыноў беларускага народа. Мы ганарымся слаўным сваім сабратам, двойчы Героем Совецкага Саюза Грыцаўцом. Мы па праву ганарымся імёнамі дзесяткаў воінаў-беларусаў, якія ў гарачых схватках з нямецка-фашысцкімі разбойнікамі заваявалі званне Героя Совецкага Саюза, мы ганарымся многатысячнай арміяй беларусаў-воінаў, узнагароджаных ордэнамі і медалямі Совецкага Саюза. Звыш сотні баявых генералаў-беларусаў вядуць свае войскі на бой з ворагам. Воіны Беларусі ўдасканальваюць свае веды, сваё баявое майстэрства. Яны памятаюць словы вялікага Сталіна, што «галоўнае зараз заключаецца ў тым, каб уся Чырвоная Армія з дня ў дзень удасканальвала сваю баявую вывучку, каб усе камандзіры і байцы Чырвонай Арміі вывучалі вопыт вайны, вучыліся ваяваць так, як гэтага патрабуе справа перамогі».

Дарагія нашы браты і сёстры, маткі і бацькі, жонкі і дзеці!

Дзень і ноч мы жывем адной думкай аб вас, аб радзімай зямлі. У жорсткім палоне беларуская зямля. Спалена і зруйнавана ўсё, што будавалі мы гадамі, тысячы блізкіх і кроўных пагнаны ў рабства, тысячы закатаваны фашысцкім звяр'ём, тысячы пакутуюць у крывавых засценках. Разбураны і апаганены нашы родныя куткі, тысячы дзяцей асірочаны, тысячы сем'яў пазбаўлены прытулку. Мы чуем стогны роднай зямлі, бачым мукі яе, бачым зарывы пажарышчаў на яе спусцелых прасторах. Увесь свет уздрыгаецца ад зверстваў немцаў на нашай зямлі, якія спальваюць нашы паселішчы, знішчаюць сотні тысяч нявінных людзей, спальваюць жывымі мірных жыхароў. Сучасны немец-фашыст паказаў сваё звярынае нутро, ён аднолькава кідаецца і на слабага старца, і на бездапаможнае дзіцё, і на бяззбройную жанчыну. Гэта яны, праклятыя немцы-варвары, тапілі нашых дзяцей у балотах і рэках, гэта яны закапвалі іх жывымі ў магілы, гэта яны спрабавалі моцнасць дзіцячых спін аб салдацкае калена... Гэта яны кінулі ў агонь 103-гадовую Еўгенію Міганенка. Бясконцы і змрочны спіс злачынстваў і цёмных зладзеянняў нямецкіх вылюдкаў, дзікіх выкармышаў звярыных, шалёных сабак фашызма. Незмываемай у вяках ганьбай лягуць гэтыя злачынствы на галаву немцаў.

Мы памятаем усё і за кожную кроплю нявіннай крыві адплоцім ворагу ў стократ. Ні адной слязы не даруем, ні адной раны не забудзем, ні адной крыўды не прапусцім, — за ўсё разлічымся поўнасцю і ў грознай расплаце сваёй не паскупімся...

Цяжкія і бязмерныя вашы пакуты, родныя браты і сёстры!

Але не зламала вас варожая няволя. Не схілілі вы каленяў перад немцамі. Захоплена Беларусь, але не пакораны народ яе, не зломлена воля яе да барацьбы і перамогі. Куляй і гранатай сустрэлі вы няпрошаных гасцей, услаўшы іх касцьмі ўсе дарогі. Вашай барацьбой партызанскай усхваляваны ўсе народы, вашай мужнасцю і гераізмам захапляецца свет. Нязгаснай славаю пакрылі сябе сыны і дочкі Беларусі — партызаны і партызанкі. Не знайшоў вораг супакою на нашай зямлі, не знойдзе яго і ў далейшым, да поўнага выгнання яго за межы любімай Радзімы. Грукат выбухаў аглошвае беларускія прасторы: лятуць пад адкос варожыя эшалоны, узлятаюць у паветра масты і склады, базы і казармы, лятуць з плеч галовы акаянных гітлераўцаў. Бязмежная нянавісць беларускага народа, суровая і грозная яго помста ворагу.

Штодзённа і штогадзінна чуем мы вас, нашы браты беларускія партызаны. Кожны ўдар ваш па ворагу тысячагалосым рэхам адгукаецца ў нашых чырвонаармейскіх сэрцах, павялічваючы ў дзесяць разоў нашы сілы і энергію, непахісную волю да барацьбы і перамогі.

Мы гордыя тым, што першыя званні Героя Совецкага Саюза за самаадданую барацьбу ў тыле працаўніка былі прысвоены мужным мсціўцам народным, беларускім партызанам Бумажкову і Паўлоўскаму. Мы ганарымся таксама слаўнымі імёнамі нашых братоў беларускіх партызан, Герояў Совецкага Саюза Заслонава, Сільніцкага, Казлова! Дзесяткі і сот-

ні бясстрашных партызан узнагароджаны савецкім урадам баявымі ордэнамі і медалямі.

Далёка за межы Радзімы праняслася бессмяротная слава камандзіра беларускай партызанскай брыгады Канстанціна Сяргеевіча Заслонава.

— «Рубанём, сябры, дадзім копаці немцам!» — так гаварыў ён сваім баявым саратнікам. І рубалі, давалі копаці... Народныя мсціўцы наносілі такія магутныя ўдары па ворагу, што ён нелалічваўся соцень сваіх паравозаў і вагонаў, дзесяткаў воінскіх эшалонаў, дзесяткаў тысяч сваіх салдат і афіцэраў.

Калі на храбрага юнака-партызана Міхаіла Сільніцкага насядала шматлікая банда немцаў, ён — адзін супроць соцень — грудзьмі прыпаў да зямлі, свінцовым дажджом паліваючы разбойнікаў. Родная зямля гадавала яго волатавай сілай, вучыла яго любіць Радзіму, вучыла нянавісці да ворага. Сільніцкі загінуў смерцю храбрых, але гэта смерць дорага каштавала немцам, многія з іх назаўсёды палеглі ў беларускай зямлі.

Сваёй гераічнай барацьбой нашы браты партызаны аказвалі і аказваюць неацанімую дапамогу Чырвонай Арміі ў яе барацьбе за вызваленне роднай зямлі. У жорсткіх і бязлітасных баях партызаны Беларусі знішчылі за дні Айчыннай вайны звыш паўтараста тысяч фашысцкіх салдат і афіцэраў, у тым ліку 13 генералаў, пусцілі пад адкос некалькі сот варожых эшалонаў, узарвалі да тысячы мастоў, збілі, знішчылі, спалілі сотні варожых самалётаў і танкаў, разграмілі дзесяткі фашысцкіх штабаў.

Вялікія і знамянальныя баявыя поспехі беларусаў-франтавікоў і беларусаў-партызан. Яны вартыя захаплення, вартыя радасці нашай. Але не да твару нам захапляцца поспехамі, не час заспакойвацца на перамогах. Яшчэ ў палоне зямля беларуская. Яшчэ ў няволі гітлераўскай пакутуюць нашы браты і сёстры. Яшчэ топча агідны забойца зямлю Радзімы, яшчэ льецца на ёй кроў нявінных людзей, яшчэ паганяць родныя прасторы фашысцкія шыбеніцы і засценкі. Яшчэ не застылі на зямлі слёзы закатаваных матак і сёстраў, яшчэ дымяцца крывёю магілы родных і блізкіх, загубленых катамі-людаедамі. Целы загінуўшых заклікаюць нас да помсты, стогны заняволеных клічуць нас да жорсткай барацьбы, да суровай адплаты ворагу. Голас продкаў заклікае нас:

— Лютая помста катам!

Радзіма-маці, наш розум і воінскі абавязак патрабуюць ад нас:

Смялей у бой! Мацней біце ворага, больш метка страляйце ў чорнае сэрца звера!

Нашы любімыя бацькі і маткі, браты і сёстры, жонкі і дзеці!

Перад надыходзячымі рашаючымі баямі з ворагам мы клянёмся вам, што свята выканаем загад вялікага Сталіна, што не пашкадуем ні крыві, ні жыцця свайго ў барацьбе за святую справу, за разгром фашысцкіх катаў. Разам з братамі сваімі, рускімі і ўкраінцамі, разам з воінамі ўсіх народаў Совецкага Саюза мы прынясём вызваленне роднай зямлі, вернем свабоду і радасць роднаму і шматпакутнаму нашаму беларускаму народу.

Свята-ж выконвайце і вы, нашы браты,



1943 г.

загад вялікага Сталіна, дадзены ім партызанам і партызанкам:

**«Наносіць магутныя ўдары па варожых тылах, шляхах зносін, воінскіх складах, штабах і прадпрыемствах, разбураць лініі сувязі праціўніка. Уцягваць шырокія пласты совецкага насельніцтва ў захопленых ворагам раёнах у актыўную вызваленчую барацьбу, ратуючы тым самым совецкіх грамадзян ад угону ў нямецкае рабства і ад знішчэння гітлераўскімі звярамі. Помсціць бязлітасна нямецкім захопнікам за кроў і слёзы нашых жонак і дзяцей, матак і бацькоў, братоў і сёстраў. Усімі сіламі дапамагаць Чырвонай Арміі ў яе барацьбе з подлымі гітлераўскімі прыгняталь-нікамі».**

Аддадзім усе сілы, усе свае здольнасці, усю энергію і волю для таго, каб у новых рашаючых баях адкінуць, разбіць і знішчыць ненавіснага ворага, назаўсёды ачысціць совецкую зямлю ад гітлераўскіх разбойнікаў.

**«Вораг ужо зазнаў сілу сакрушальных удараў нашых войск. Блізіцца час, калі Чырвоная Армія з арміямі нашых саюзнікаў зломіць хрыбет фашысцкаму зверу». (І. Сталін).**

**Наперад-жа, браты, у рашаючы бой!**

**У бой за нашу зямлю, за наша жыццё і свабоду!**

**Смерць нямецкім катам і забойцам!**

**Слава Чырвонай Арміі і партызанам!**

**Слава СТАЛІНУ!**

**Слава Радзіме нашай Беларусі!**

Пісьмо падпісалі воіны-беларусы:

Каўшараў Іван — Герой Совецкага Саюза, капітан; Камера Іван — генерал-палкоўнік артылерыі; Барсукоў Іван — чырвонаармеец; Самойлаў Т. П. — гвардыі чырвонаармеец; Ерэменка А. І. — генерал-палкоўнік, кавалер ордэна Суворава І ступені; Жарнасек Я. Ф. — гвардыі маёр; Абухоўскі І. Е. — малодшы лейтэнант, ордэнаносец Панкевіч І. А.. — гвардыі старшына; Ладуцька Н. В. — гвардыі чырвонаармеец; Тарбянкоў Антон — чырвонаармеец; Лось І. — чырвонаармеец; Пагуда — генерал-маёр; Кірэеў А. Д. — палкоўнік; Каласоўскі Н . М. — маёр; Купчык І. — сержант; Чарнякоў Е. К. — гвардыі старшына; Беляк Д. — гвардыі чырвонаармеец; Аўчыннікаў І. І. — чырвонаармеец; Каленчанка В. П. — чырвонаармеец; Шухроў М. М. — чырвонаармеец; Ярдоўскі І. І. — маёр, узнагароджан медаллю «За баявыя заслугі»; Леонаў І. Л. — маёр; Портнік Л. І. — капітан; Еленаў В. А. — гвардыі старшы лейтэнант; Вострыкаў А. С. — гвардыі лейтэнант; Шляхценка В. М. — лейтэнант; Чарняк С. І. — Герой Совецкага Саюза, палкоўнік; Аўсеенка Ф. Х. — маёр; Зуеў В. С. — малодшы сержант; Дворак Н. П. — ефрэйтар; Мардашоў С. В. — ефрэйтар; Грэчка Н. Д. — чырвонаармеец; Шалбанаў А. П. — чырвонаармеец; Скрыпка Н. В. — ефрэйтар, узнагароджан медаллю «За адвагу»; Гайдукоў Д. А. — старшы сержант; Гапановіч — генерал-маёр; Букштыновіч І. — палкоўнік; Драздоў А . М. — маёр; Тамашоў І. А. — маёр; Чунаў І. П. — капітан; Дзівоні Ю. К. — капітан, узнагароджан медаллю «За баявыя заслугі»; Сергіенка І. С. — старшы лейтэнант; Купчанка Алек. Ф. — гвардыі малодшы лейтэнант; Крыцкі А. А. — сержант; Маскаленка С. С. — чырвонаармеец; Дзянісёнак Н. М. — чырвонаармеец; Давыдзенка А. С. — сержант; Зуеў А. Л. — чырвонаармеец; Паўлёнак Д. І. — ефрэйтар, узнагароджан медаллю «За баявыя заслугі»; Літвінаў В. А. — старшы сержант, узнагароджан медаллю «За адвагу»; Лукашевіч Ф. А. — старшы тэхнік-лейтэнант; Васілеўскі Г. Н. — старшы лейтэнант; Голахаў А. І. — гвардыі старшы лейтэнант; Дзя-

**мідаў Ф. С.** — капітан, ордэнаносец; **Пальвінскі В. Д.** — капітан; **Дабравольскі Е. В.** — генерал-маёр; **Шашкоў Г. К.** — палкоўнік, ордэнаносец; **Заяц Н. Ф.** — контр-адмірал; **Сарока І. А.** — капітан; **Скалабан М. К.** — гвардыі старшы лейтэнант; **Лісоўскі С. Ф.** — лейтэнант; **Пышнёў Л. І.** — ефрэйтар; **Кукушкін В. Д.** — чырвонаармеец; **Аляксееў Н. Ф.** — ефрэйтар; **Быхавец Д. Д.** — малодшы сержант; **Кавалёў А. І.** — чырвонаармеец; **Вістукоў І. А.** — чырвонаармеец; **Кавалёў Ф. В.** — сержант; **Дручкін К. С.** — чырвонаармеец; **Урбан К. Ф.** — чырвонаармеец; **Лапуноў Н. П.** — гвардыі старшы лейтэнант; **Кажамячанка П. Я.** — гвардыі старшы лейтэнант; **Габароў А. Ф.** — капітан; **Зарэмбоўскі Б. С.** — палкоўнік; **Кузьмін К. М.** — лейтэнант; **Бандарчык Н. А.** — лейтэнант; **Владзіміраў М. П.** — лейтэнант; **Пінчук Г. С.** — Герой Совецкага Саюза, капітан; **Лебедзеў Б. Р.** — чырвонаармеец; **Лысіпа М. Е.** — чырвонаармеец; **Іваноў С. Н.** — сержант; **Кажамяценка Г. А.** — чырвонаармеец; **Чумакоў І. В.** — чырвонаармеец; **Канчар М. П.** — старшы сержант, узнагароджан медаллю «За адвагу»; **Каралёў А. Д.** — старшы лейтэнант; **Юхневіч М. А.** — малодшы лейтэнант; **Кашульскі В. П.** — капітан; **Умрэйка С. А.** — маёр; **Шамко Л. В.** — старшы выкладчык ваеннага вучылішча; **Люхцікаў А. С.** — генерал-маёр; **Чыжоў М. Г.** — маёр, узнагароджан медаллю «За адвагу»; **Краўцоў С. Ф.** — чырвонаармеец; **Сцефаненка Г. Е.** — сержант; **Гарбаценка Г. А.** — малодшы сержант, ордэнаносец; **Быкаў А. А.** — чырвонаармеец; **Коганаў С. Н.** — ефрэйтар; **Панаў В. П.** — ефрэйтар; **Лапшак Н. М.** — чырвонаармеец; **Тарасёў В. Г.** — чырвонаармеец; **Соф'еў Ф. Н.** — чырвонаармеец; **Федарэнка Г. М.** — малодшы сержант; **Асташонак Н. І.** — чырвонаармеец; **Дзевяковіч С. А.** — чырвонаармеец; **Дзегцяроў Е. М.** — маёр, ордэнаносец; **Філатаў Н. Ф.** — гвардыі капітан; **Ваніфоцьеў А. І.** — капітан; **Ермаловіч А. М.** — старшы лейтэнант, ордэнаносец; **Магучы С. В.** — старшы лейтэнант, ордэнаносец; **Пачыкоўскі Б. А.** — генерал-маёр авіяцыі; **Казлоўскі І. Н.** — палкоўнік; **Хадакоў П.** — палкоўнік, ордэнаносец; **Дыдо В.** — гвардыі маёр, ордэнаносец; **Цясто С. Ф.** — старшы лейтэнант; **Кісялёў А. П.** — старшы лейтэнант;

кавалер ордэна Александр Неўскі; **Сенцюраў С. Т.** — старшы лейтэнант; **Каяніна І. С.** — старшы сержант; **Леановіч В. К.** — старшына; **Хадаронак І. М.** — малодшы сержант; **Святаў І. Ф.** — чырвонаармеец; **Нікулёнак Е. І.** — чырвонаармеец; **Ільін Т. В.** — чырвонаармеец; **Пятроў Г. К.** — малодшы сержант; **Врублеўскі С. А.** — палкоўнік, ордэнаносец; **Лексянкоў Я. М.** — гвардыі сержант; **Міхайлоўская М. В.** — сержант; **Куцаеў В. Г.** — малодшы сержант; **Лыгач В.** — гвардыі малодшы сержант; **Рэбец А.** — гвардыі чырвонаармеец; **Галіцкі К.** — генерал-лейтэнант; **Недзвецкі В. І.** — палкоўнік; **Аксёнаў І. І.** — капітан; **Шарстнёў С. І.** — капітан, узнагароджан медаллю «За адвагу»; **Кузьменка Г. В.** — гвардыі старшы лейтэнант; **Міхалькоў І.** — гвардыі старшы лейтэнант; **Корбут Е. Б.** — старшы лейтэнант; **Ражко П. С.** — старшы лейтэнант; **Панормленка П. С.** — старшы лейтэнант; **Аўдзееў М. В.** — Герой Совецкага Саюза, падпалкоўнік; **Лёля В. А.** — капітан, ордэнаносец; **Ліс С. М.** — капітан, ордэнаносец; **Белаус І. І.** — гвардыі чырвонаармеец; **Семянец Ф. Д.** — гвардыі чырвонаармеец; **Попель В. Г.** — малодшы сержант; **Міхаленка П. Н.** — ефрэйтар; **Анушка Е. Х.** — чырвонаармеец; **Маслакоў Д. П.** — старшы сержант; **Мазырэц К. Т.** — сержант: **Шакалян В. А.** — старшы сержант; **Казакоў В. Л.** — старшына; **Бандаровіч П. А.** — старшына; **Аносік Б. А.** — старшына; **Тарахаў І. П.** — старшы сержант; **Дукарэвіч Ніна**—чырвонаармеец; **Ганчараў Н. І.** — чырвонаармеец; **Жукаў М. І.** — чырвонаармеец; **Ярэц І. В.** — чырвонаармеец, узнагароджан двума медалямі «За адвагу»; **Цыганкоў С. С.** — чырвонаармеец, ордэнаносец; **Раманцоў Т.** — гвардыі чырвонаармеец; **Кармызаў А. Н.** — старшы лейтэнант; **Патапаў С. С.** — генерал-маёр; **Майсеенка А. Ф.** — палкоўнік, ордэнаносец; **Грэчанік Н.** — гвардыі капітан; **Самсонаў Е. В.** — старшы лейтэнант, узнагароджан медаллю «За баявыя заслугі»; **Бажэнка С. А.** — старшы лейтэнант; **Прышчэп П. К.** — сержант; **Свірыдзенка Н. Н.** — сержант; **Шарковіч І. Ф.** — сержант; **Ткачоў П. І.** — чырвонаармеец; **Сталяроў Л. Н.** — чырвонаармеец; **Якавец П. А.** — старшы сержант; **Бажун І. С.** — чырвонаармеец; **Літвінцоў П. В.** — чырвонаармеец; **Гаўрыкаў Г. П.** — чырвонаармеец; **Скрыпко А. А.** — чырвонаармеец; **Барадоўскі**

І. М. — чырвонаармеец; Прыгун А. І. — чырвонаармеец; Аканон І. А. — ефрэйтар; Татарынаў С. А. — чырвонаармеец; Семенчукоў В. С. — чырвонаармеец; Барадаўскі Н. І. — ефрэйтар; Чэрталысаў І. Д. — ефрэйтар; Драздоў Г. М. — ефрэйтар; Лебедзеў Я. К. чырвонаармеец; Гамінскі Г. Г. — чырвонаармеец; Кузьміноў А. А. — ефрэйтар; Волкаў І. Ф. — чырвонаармеец; Нікалаеў П. Д. — чырвонаармеец; Сініла І. М. — капітан, узнагароджан ордэнам Чырвонай Звязды; Анушанка С. К. — чырвонаармеец; Мельнікаў І. М. — чырвонаармеец Галуза Ф. С. — чырвонаармеец; Прэснякоў А. І. — чырвонаармеец; Ралюкевіч М. Е. — сержант; Камлёў А. Н. — чырвонаармеец; Краснабаеў І. В. — чырвонаармеец; Грыгор'ева Н. І. — чырвонаармеец; Жалудкова В. Т. — чырвонаармеец; Кобрына Р. Б. — чырвонаармеец; Іофе М. М. — лейтэнант медслужбы; Калека А. В. — чырвонаармеец; Пацабедаў І. І. — лейтэнант; Марусевіч І. І. — чырвонаармеец; Прахарэнка Л. Н. — чырвонаармеец; Лагуценка Т. П. — малодшы сержант; Скрыпкін А. А.—старшы сержант; Талсташэеў П. П.— чырвонаармеец; Праскураў А. Н. — лейтэнант; Магучы М. Н. — старшы сержант; Хітроў Т. В. — сержант; Абметка І. І. — малодшы сержант; Шпакоўскі Л. К.—старшы сержант, узнагароджан ордэнам «Айчыннай вайны» II ступені; Новікаў І. М. — лейтэнант; Залівака І. А. — сержант; Старавойтаў Я. Б. — старшы лейтэнант, узнагароджан ордэнам Чырвонай Звязды; Гладкі К. С. — старшы лейтэнант; Палаўчэня Г. А. — падпалкоўнік, Герой Совецкага Саюза; Фралоў Г. В. — капітан; Дольнікаў І. Г. — лейтэнант; Кальцоў П. В. — маёр; Кушчнер П. Г. — малодшы лейтэнант; Ісаковіч Ф. І. — лейтэнант; Ананенка П. В. — лейтэнант; Грушэвіч І. Н. — лейтэнант; Раманаў А. Е. — чырвонаармеец; Паўлаў А. А.—чырвонаармеец; Цыгунаў В. В. — чырвонаармеец; Клімянкоў П. М. — чырвонаармеец; Балуга М. І.—сержант; Грыгор'еў В. Л. — чырвонаармеец; Медзвецкі В. І.— чырвонаармеец; Бракавіцкі Н. Н. — малодшы сержант; Ліпай С. А. — лейтэнант; Севераў Б. Д. — лейтэнант; Шыманоўскі Ф. І. — лейтэнант; Смалякоў Г. Е. — маёр; Гарбачоў М. К. — старшы лейтэнант; Выраў С. І. — лейтэнант; Каменшчыкаў І. С.—старшы сержант; Брыкаў Е. Е. — сержант; Бараноўскі

**В. Г.** — старшына; **Дзергачоў Б. Ф.** — малодшы сержант: **Ганелін Г. Д.** — гвардыі старшы лейтэнант; **Забабон І. К.** — старшы сержант; **Сапрэнкоў К. А.** — сержант; **Дранцоў М. П.**—сержант; **Халаімаў Е. А.**— старшына; **Гардзейчык П. С.** — лейтэнант; **Кавалёў В. П.** — малодшы лейтэнант; **Казачэнка І. Ф.** — лейтэнант; **Халяўкін І. Н.** — малодшы лейтэнант; **Пратасевіч І. М.** — малодшы лейтэнант; **Гаўрыльчык К. К.** — сержант; **Ярчок І. А.** — старшы сержант; **Ільеў П. Ф.** — сержант; **Храмчанка В. С.** — лейтэнант; **Драздоў І. І.** — сержант; **Садоўскі Д. І.** — чырвонаармеец; **Касабуцкі Б. Г.** — лейтэнант; **Маліноўскі П. Ф.** — сержант; **Храмчанка В. С.** — лейтэнант; **П. В.** — старшы сержант; **Сіновіч І. К.** — чырвонаармеец; **Дубяга Н. М.** — чырвонаармеец; **Касцючэнка Г. Н.** — чырвонаармеец; **Румо І. А.** — чырвонаармеец; **Педрык М. І.** — чырвонаармеец; **Сулімаў В. М.** — ефрэйтар; **Мураўёў Н. А.** — чырвонаармеец; **Сцяпанаў В. В.** — чырвонаармеец; **Шкульцецкі М. С.** — чырвонаармеец; **Марчанка І. Т.** — чырвонаармеец; **Семашка В. П.** — старшы сержант; **Мінчанка Ф. К.**— чырвонаармеец; **Паўлёнак С. М.** — чырвонаармеец; **Науменка Е. І.** — чырвонаармеец; **Якушэў С. М.** — чырвонаармеец; **Касоўская А. В.** — чырвонаармеец; **Кавалёў В.** — чырвонаармеец; **Менточанка А. К.** — лейтэнант; **Вдоўкін С. І.** — чырвонаармеец; **Пісараў К. Г.** — чырвонаармеец; **Макараў П. М.** — чырвонаармеец; **Палітыка А. П.** — чырвонаармеец; **Малашкоў С. А.** — чырвонаармеец; **Дубінчык В. Я.** — лейтэнант; **Маслоўскі М. С.** — чырвонаармеец; **Карамзін П. Ф.** — чырвонаармеец; **Марчанка П. Ф.**—лейтэнант; **Шаркоў Н. А.** — чырвонаармеец; **Гуленнікаў В. І.** — чырвонаармеец; **Мініч Л. А.** — старшы сержант; **Лось А. А.** — малодшы сержант; **Зарубіцкі А. А.**— чырвонаармеец; **Паташкін Б. Г.** — лейтэнант; **Казута І. Г.** — тэхнік 2-га ранга; **Арэшка М. Г.** — чырвонаармеец; **Лясук В. В.** — чырвонаармеец; **Ерэменка А. Д.** — чырвонаармеец; **Ліўшыц І. М.** — малодшы сержант; **Каралькоў В. Д.** — чырвонаармеец; **Белахвост П. С.** —чырвонаармеец; **Кісялёў В. Ф.** — старшына; **Кулагін А. Я.** — лейтэнант; **Матвееў Ф. І.** — чырвонаармеец; **Аўхімовіч Г. С.** — сержант; **Пінкіна М. С.** — фельчар; **Жыжоў Н. К.** — лейтэнант; **Місючэнка А. Ф.** — сержант; **Ржэцкі Л. Ф.** — п/п 2-га

ранга; Сокалаў Ф. Е. — чырвонаармеец; Ткачоў В. Г. — малодшы лейтэнант; Кавалёў Л. В. — чырвонаармеец; Кавалёў В. М. — чырвонаармеец; Пакатаеў Д. Ф. — падпалкоўнік; Аляксандраў П. А. — гвардыі генерал-маёр; Лаўроў Ф. І. — старшы лейтэнант; Дзеньдобры В. П. — гвардыі малодшы лейтэнант; Закрэўскі Г. К. — старшы сержант; Барсукоў Ф. Л. — сержант; Петрачэнка Н. П. — гвардыі старшы сержант; Кладкевіч І. Е. — гвардыі чырвонаармеец; Калецкі А. А. — гвардыі сержант; Туміловіч А. А. — чырвонаармеец; Сонавянюк І. Н. — чырвонаармеец; Федаценка А. П. — гвардыі сержант; Дзянісенка М. П. — чырвонаармеец; Маліноўскі Ф. Э. — чырвонаармеец; Лесюкоў А. Н. — чырвонаармеец; Багданаў П. К. — чырвонаармеец; Юркевіч Г. С. — чырвонаармеец; Караленка Н. К. — чырвонаармеец; Пракап'юк Г. Д. — чырвонаармеец; Рубінаў П. Г. — чырвонаармеец; Шанметак М. М. — чырвонаармеец; Валчэцкі Л. П.—гвардыі старшы лейтэнант; Глянцаў І. Я.—гвардыі лейтэнант; Дуброўскі В. С.—малодшы лейтэнант; Бушынаў А.—старшына; Галімаў А. С. — гвардыі старшы сержант; Гарэлікаў Г. Г.—чырвонаармеец; Казак І. А.—чырвонаармеец; Юрчанка В. П. — чырвонаармеец; Блешчык А. А. — сержант; Вярбіцкі В. М. — сержант; Лукорскі В. А. — чырвонаармеец; Рысюк Н. П. — сержант; Пруткоў В. К. — чырвонаармеец; Гапоненка Ф. — чырвонаармеец; Дворнікаў А. Е. — чырвонаармеец; Хмялеўскі М. Н. — чырвонаармеец; Кашанскі Ф. Г. — чырвонаармеец; Бранявіцкі П. С. — генерал-маёр берагавой службы, ордэнаносец; Скрыганаў М. П. — контр-адмірал, ордэнаносец, і другія.

У абмеркаванні пісьма прынялі ўдзел 25 тысяч байцоў і афіцэраў Чырвонай Арміі.

☆

## СЛОВА ВОІНАЎ-БЕЛАРУСАЎ ДА СВАЙГО НАРОДА

Нязгаснай славай пакрылі сябе воіны-беларусы, разам з рускімі, украінскімі братамі, сынамі Грузіі, Арменіі і Азербайджана, з усімі сынамі народаў Совецкага Саюза, якія змагаюцца супроць ненавіснага ворага за чэсць і свабоду сваёй Радзімы. У сваім лісце да партызан і партызанак, да ўсяго беларускага народа, які друкуецца сёння на старонках «Известий», воіны-беларусы расказваюць аб геараічных справах лепшых, найбольш выдатных сыноў Беларусі, імёны якіх прагрымелі на ўвесь Совецкі Саюз.

Хто не ведае імя слаўнага сына Беларусі, Героя Совецкага Саюза генерала Даватара, пад кіраўніцтвам якога баявыя казачыя палкі грамілі фашысцкія войскі ў глыбокім нямецкім тыле! Вякамі будзе жыць імя Героя Совецкага Саюза легендарнага капітана Гастэла. Беларускі народ ганарыцца сваімі сынамі — Героем Совецкага Саюза адважным танкістам Палаўчэня, Героем Совецкага Саюза слаўным лётчыкам Віктарам Талаліхіным. На марскіх прасторах Балтыкі праславіўся Герой Совецкага Саюза, сын беларускага народа лётчык-знішчальнік Аляксей Антоненка. Тут тапіў

ворагаў сын Беларусі віцэ-адмірал Дрозд. Больш сотні фашыстаў палягло на подступах да Ленінграда ад рукі снайпера-беларуса, юнага Героя Совецкага Саюза Феадосія Смалячкова. На франтах Айчыннай вайны ў радах Чырвонай Арміі змагаюцца 108 генералаў-беларусаў, тысячы афіцэраў, сотні тысяч воінаў. Яны свята выконваюць наказ сваіх бацькоў і дзедаў аб кроўным адзінстве з рускім і ўкраінскім народамі, як іх продкі, яны мужна і смела вядуць барацьбу з чужаземнымі захопнікамі, не шкадуючы ні сіл сваіх, ні самога жыцця свайго.

Сягоння лепшыя прадстаўнікі беларускага воінства звяртаюцца з гарачым заклікам да сваіх братоў і сёстраў, бацькоў і матак, якія знаходзяцца на беларускай зямлі, часова акупіраванай нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

«Дзень і ноч мы жывем адной думкаю аб вас, аб радзімай зямлі. У жорсткім палоне беларуская зямля. Спалена і зруйнавана ўсё, што будавалі мы гадамі, тысячы блізкіх і кроўных пагнаны ў рабства, тысячы закатаваны фашысцкім звяр'ём, тысячы пакутуюць у крывавых турмах. Разбураны і апаганены нашы родныя куткі, тысячы дзяцей асірочаны, тысячы сем'яў пазбаўлены прытулку. Мы чуем стогны роднай зямлі, бачым мукі яе, бачым зарывы пажарышчаў на яе спусцелых прасторах».

Шыбеніцамі, турмамі пакрылі гітлераўцы беларускую зямлю. Крывавым тэрорам, масавымі расстрэламі прабуюць яны паставіць на калені беларускі народ, зрабіць яго нявольнікам германскіх разбойнікаў. Але ніякія катаванні і зверствы не зламалі волю і мужнасць

беларускага народа, які любіць свабоду, сваю зямлю, сваю совецкую Радзіму. Не пакарыўся немцу і не пакорыцца ніколі ні стары, ні малады! Лютай ненавісцю гарачь іх сэрцы. Са зброяй у руках б'юцца лепшыя сыны і дочкі Беларусі — слаўныя партызаны і партызанкі з драпежным і каварным ворагам. Гэта яны сваімі рукамі вынішчылі за час Айчыннай вайны звыш 150 тысяч нямецкіх салдат і афіцэраў, у тым ліку 13 генералаў. Гэта яны, смелыя партызаны, пусцілі пад адкос некалькі сот варожых эшалонаў. Гэта яны, бясстрашныя героі свайго народа, узарвалі да тысячы мастоў, збілі, знішчылі і спалілі сотні варожых самалётаў і танкаў, разгрмілі дзесяткі фашысцкіх штабаў.

Непакойна сябе адчуваюць гітлераўцы на Беларусі. Гарыць пад нагамі захопнікаў беларуская зямля. Самі захопнікі вымушаны прызнаць эфектыўнасць партызанскага руху на Беларусі. Вось што пісала нядаўна гітлераўская газета «Дэйчэ альгемейне цэйтунг» пра беларускіх партызан і партызанак: «Яны вядуць жорсткую барацьбу з нямецкімі акупацыйнымі войскамі, пагражаючы падвозу, чыгуначнаму руху і нашай аднаўленчай рабоце. Нельга адмаўляць, што гэтая барацьба каштуе нам ахвяр, скоўвае нашы сілы, прыносіць нам сур'ёзны ўрон».

Не выпадкова, што першае званне Героя Совецкага Саюза за самааддзяную барацьбу ў тыле праціўніка было прысвоена народным мсціўцам — беларускім партызанам Бумажкову і Паўлоўскаму. Далёка за межамі Радзімы

пранеслася бяссмертная слава аб камандзіры беларускай партызанскай брыгады Канстанціне Заслонаве.

З верай і надзеяй чакаюць беларускія людзі сваіх узброеных сыноў, якія змагаюцца ў радах слаўнай Чырвонай Арміі. Яны ведаюць, што недалёка той час, калі палкі Чырвонай Арміі прыдуць да нас і вызваляць беларускую зямлю ад нямецкай погані, адпомсцяць ворагу за слёзы і кроў беларускага народа.

Ажыццяўляючы план Вярхоўнага Галоўнакамандавання, нашы войскі ідуць наперад, разбіваючы адборныя часці нямецкай арміі. Заняўшы Орол і Белгорад, савецкія войскі вядуць наступленне далей, вызваляючы ўсё новыя і новыя населеныя пункты.

«Правал летняга наступлення немцаў і паражэнне нямецкіх войск пад Орлом і Белгорадам гавораць аб тым, што Чырвоная Армія ва ўмовах лета здолела не толькі замацаваць, але і развіць свае наступальныя поспехі.

Цяпер канчаткова рухнулі надзеі немцаў і іх прыхвасняў на спрыяльны паварот ваенных дзеянняў ва ўмовах лета.

Тым самым выкрыта казка немцаў аб тым, што быццам-бы савецкія войскі не могуць весці летам паспяховае наступленне». (Совінформбюро).

Разам з рускімі і ўкраінцамі, грузінамі і армянамі, казахамі і кіргізамі ў радах Чырвонай Арміі змагаюцца храбрыя сыны Беларусі— байцы, афіцэры, генералы. Пад Орлом і Белгорадам, на Кубані, на Ладазе яны змагаюцца за вызваленне сваей роднай беларускай зямлі.

У клятвах на ўвесь свет гучаць іх словы, звернутыя сягоння да беларускага народа:

«Нашы любімыя бацькі і маткі, браты і сёстры, жонкі і дзеці.

Перад надыходзячымі рашаючымі баямі з ворагам мы клянёмся вам, што свята выканаем загад вялікага Сталіна, што не пашкадуем ні крыві, ні жыцця свайго ў барацьбе за святую справу, за разгром фашысцкіх катаў. Разам з братамі сваімі, рускімі і ўкраінцамі, разам з воінамі ўсіх народаў Совецкага Саюза мы прынясем вызваленне роднай зямлі, вернем свабоду і радасць роднаму і шматпакутнаму нашаму беларускаму народу».

Ад імя беларусаў-воінаў яны гавораць свайму народу: «Свята-ж выконвайце і вы, нашы браты, загад вялікага Сталіна, дадзены ім партызанам і партызанкам».

Слова воінаў-беларусаў абляціць усю беларускую зямлю, паланёную немцамі, і ў адказ на гарачы заклік сваіх родных братоў, бацькоў і сыноў беларускі народ, яго партызаны і партызанкі ўзмацняць сваю барацьбу супроць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, і новыя дзесяткі тысяч катаў знойдуць сабе магілу на беларускай зямлі. Мацней-жа біце ворага, браты-беларусы. Перамога будзе наша!

☆

ЗМЕСТ

Стар.

Голас беларускага народа — перадавая газеты «Правда» № 198 ад 9/VIII—1943 г. . . . . . 3

Зварот воінаў-беларусаў да партызан і партызанак, да ўсяго беларускага народа . . . 8

Слова воінаў-беларусаў да свайго народа — перадавая газеты «Известия» № 186 ад 8/VIII—1943 г. . 25

☆

Адказны за выпуск *І. Гурскі.*

Падпісана да друку 30/VIII 1943 г. 1 друк. аркуш. А 2726. Заказ № 1396. Тыраж 75 000.

Друкарня «Красный пролетарий». Масква, Краснапролетарская, 16.

Цана 20 кап.